***Носік А.А., Качан А.С.***

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ "БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА" ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ СТАМАТАЛАГІЧНАГА ПРОФІЛЮ

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле закранаюцца найбольш эфектыўныя метады навучання, якія могуць быць прыменены пры выкладанні дысцыпліны "Беларуская мова: прафесійная лексіка" для спецыяльнасцей стаматалагічнага профілю. Абгрунтоўваецца мэтазгоднасць прымянення кожнага метаду ў адпаведнасці з навучальным матэрыялам.

*Ключавыя словы: метады; медыцынская тэрміналогія; праблемна-арыентаванае навучанне; дыстанцыйнае навучанне.*

***Nosik A. A, Kachan A.S.***

# INNOVATIVE APPROACHES THE TECHNIQUUE OF TEACHING THE SUBJECT "BELARUSIAN LANGUAGE: PROFESSIONAL VOCABULARY" FOR DENTAL SPECIALTIES

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article discusses the most effective teaching methods that can be applied in teaching the subject "Belarusian language: professional vocabulary" for dental specialties. It is substantiate the expediency of using each method in accordance with the educational material.

*Keywords: methods; medical terminology; problem-oriented learning; distance learning.*

Засваенне беларускай мовы ў прафесійным аспекце накіравана на ажыццяўленне вербальных зносін у афіцыйнай сферы, абавязковай умовай якога з'яўляецца бесперапыннае пашырэнне актыўнага і пасіўнага лексікону будучага спецыяліста. Разумна меркаваць, што ў дадзеных адносінах сістэматычнае засваенне агульнаўжывальнай лексікі будзе недастатковым без авалодання вузкаспецыяльнай тэрміналогіяй. Дасягненне неабходнага лексічнага ўзроўню, фарміраванне камунікатыўных навыкаў асноўваецца на вывучэнні асобных тэматычных груп лексікі і выкарыстанні розных відаў творчых прац па развіцці маўлення: пераказу, перакладу, сачынення.

Выкладанне медыцынскай тэрміналогіі для стаматалагічных спецыяльнасцей мае свае асаблівасці. Да ліку асноўных метадаў эфектыўнага навучання студэнтаў адносяцца:

1. Кантэкстуальнае выкарыстанне тэрмінаў. Медыцынскую тэрміналогію лепш за ўсё вывучаць у кантэксце. Таму пры выкладанні дысцыпліны "Беларуская мова: прафесійная лексіка" для спецыяльнасцей стаматалагічнага профілю неабходна паказаць студэнтам прыклады выкарыстання тэрмінаў у

рэальных сітуацыях, напрыклад, практычныя заняткі, лекцыі з карыстаннем візуальных матэрыялаў.

2. Групавыя праекты: фарміраванне груп, у якіх студэнты разглядаюць пэўныя аспекты стаматалогіі і разбіраюць тэрміналогію, дазваляе ім вывучаць яе праз актыўнае супрацоўніцтва. Групы могуць аналізаваць утварэнне тэрмінаў на аснове беларускамоўнай лексікі і на аснове грэчаска-лацінскіх тэрмінаэлементаў праз іх адаптацыю да фанетычных і граматычных норм беларускай мовы; разглядаць спецыфіку захворванняў поласці рота; практыкавацца ў магчымых накірунках абслугоўвання пацыентаў. Так, адным з варыянтаў працы з’яўляецца творчае заданне па складанні дыялогу ў сітуацыі “урач – пацыент” падчас прыёму ў клініцы па наступным сцэнарыі: “*Да ўрача прыйшоў пацыент, які скардзіцца, што ў яго баліць зуб злева ўверсе. Боль моцны, аддае ў суседнія зубы, скронь і вуха. Найбольш востра адчуваецца падчас прыёму ежы”.*

3. Сучасныя метады выкладання, такія як праблемна-арыентаванае навучанне, дыстанцыйнае навучанне і выкарыстанне мультымедыйных рэсурсаў (відэа- і аудыя-), дапамагаюць студэнтам лепш арыентавацца ў тэмах і засвойваць медыцынскую тэрміналогію. Напрыклад, студэнтам ставіцца праблемнае пытанне, прапаноўваецца прагляд кароткага дакументальнага фільма, урывак інтэрв’ю з урачамі ці пацыентамі па зададзенай тэме, пасля чаго даецца час на падрыхтоўку і далей праводзіцца абмеркаванне магчымых спосабаў вырашэння. У сучасных рэаліях актуальнымі і найбольш дыскусійнымі тэмамі з’яўляюцца, напрыклад, адбельванне зубоў, электрычныя зубныя шчоткі, скайсы, ірыгатары, уплыў хімічных элементаў на стан зубоў, догляд за малочнымі зубамі і многія іншыя. Абмеркаванне дадзеных тэм павінна базіравацца на абавязковым выкарыстанні беларускіх і запазычаных тэрмінаў.

4. Уключэнне паняцця медыкалізацыі як элемента ўрачэбнага кантролю або складовага кампанента дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі. Разважанні на тэму павышанай залежнасці пацыента ад урача як транслятара медыцынскіх ведаў, ад яго рэкамендацый для хуткага забеспячэння эмацыянальнага камфорту і фізічнай бяспекі закранае многія аспекты сучаснага жыцця. Не выключэннем з’яўляецца і стаматалагічная вобласць медыцыны, калі эстэтычныя патрэбы пацыента пераважаюць над рэальнай неабходнасцю медыцынскага ўмяшання ў анатомію ротавай поласці. Так ці інакш, укараненне дадзенага элемента навучання прадугледжвае зварот да стаматалагічнай тэрміналогіі і ў выніку спрыяе фарміраванню прафесійных камунікатыўных навыкаў.

5. Фарматыўная ацэнка: метад фарматыўнай ацэнкі дазваляе студэнтам пашыраць свае веды ў галіне медыцынскай тэрміналогіі. Ён можа ўключаць частковае разгадванне пазіцый, паказанне ўмоў і выпадковых тэрмінаў у практычных сітуацыях.

6. Пастаянная падтрымка: адаптаванне метадаў выкладання і ацэнкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі студэнтаў і адзнакамі можа паспрыяць эфектыўнаму выкладанню медыцынскай тэрміналогіі. Пастаянны маніторынг і абмеркаванне мэт, праграм навучання – спосабы дапамагчы студэнтам максімізаваць свае магчымасці вывучэння тэрміналогіі. Да прыкладу, адаптацыйныя паказчыкі, якія заключаюцца ў магчымасці пераходу на

беларускую мову падчас камунікацыі на занятках, здольнасці прымяняць правілы са школьнай праграмы пры вывучэнні новага, больш ускладненага матэрыялу (пераклад вузкаспецыяльных тэрмінаў і іх азначэнняў) больш высокія пры выкананні пісьмовых заданняў. Аднак непрацяглы тэрмін навучання студэнтаў-першакурснікаў ў ВНУ не дазваляе ахапіць вялікі аб’ём тэрміналогіі і таму звужае магчымасці ўключэння клінічных тэрмінаў у пэўныя віды заданняў. Так, падчас вуснага перакладу і пераказу спецыялізаваных тэкстаў узнікае неабходнасць больш грунтоўнай працы над папаўненнем лексічнага запасу медыцынскай тэрміналогіяй і абавязковага ўзнаўлення граматычных тэм, паколькі адной з істотных прычын парушэння пісьменнага выказвання з’яўляецца ўплыў рускай мовы і яе істотная перавага ў паўсядзённым практычным выкарыстанні.

Такім чынам, для дасягнення эфектыўнага выніку авалодання медыцынскай тэрміналогіяй адукацыйны працэс павінен мець на мэце камунікатыўную практычную накіраванасць, якая прадугледжвае выпрацоўку навыкаў выкарыстання анатамічных і клінічных тэрмінаў, ажыццяўленне камунікацыі на беларускай мове ў прафесійнай сферы, вядзенне дзелавой перапіскі, выступленне з навуковымі паведамленнямі і прамовамі. Прымяненне розных дыдактычных метадаў паспрыяе лагічнаму і сістэматызаванаму прадстаўленню матэрыялу, а таксама больш свабоднай арыентацыі студэнтаў у праграмных тэмах.

**Літаратура**

1. Носік, А.А. Пераклад тэкстаў медыцынскай тэматыкі як сродак выхавання і навучання прафесійнай лексіцы / А.А. Носік, Н.В. Ратынская. – XX Міжнародная навуковапрактычная канферэнцыя “Тэхналогіі навучання рускай мове як замежнай і дыягностыка моўнага развіцця” – Мінск: БДМУ, 2019 (эл. зборнік). С. 301- 306.

2. Яленскі, М.Г. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі [ і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

3. Ляшчынская, В.А. Студэнту аб мове: Прафесійная лексіка / В.А. Ляшчынская. – Мінск: УП “ІВЦ Мінфіна”, 2003. – 243 с.